# Заходнееўрапейская літаратурная казка ў гістарычным аспекце

В. Ч. Хвайніцкая

# Літаратурная казка

– гэта цэлы напрамак у мастацкай літаратуры.

За доўгія гады свайго станаўлення і развіцця літаратурная казка стала ўніверсальным жанрам, які ахоплівае ўсе з'явы навакольнага жыцця і прыроды, адлюстроўвае дасягненні навукі і тэхнікі

**У канцы XVI ст. – пачатку XVII ст. у еўрапейскім вышэйшым грамадстве абуджаецца мода на казкі.**

**Чытанне і слуханне казак становіцца адным з распаўсюджаных захапленняў свецкага грамадства. Некаторыя аддаюць перавагу філасофскім казкам, іншыя аддаюць даніну казкам старадаўнім, якія захаваліся ў пераказах бабуль.**

**Літаратары запісваюць казкі, апрацоўваючы знаёмыя ім з дзяцінства сюжэты, і вусная казачная традыцыя паступова пачынае пераходзіць у пісьмовую.**




**Пачынальнікам пісьмовай традыцыі лічыцца**

**Джамбаці́ста Базі́ле**

**(1566–1632) – неапалітанскі паэт і пісьменнік-казачнік.**

**Зборнік «Казка казак» («Пентамерон»), напісаны ў стылі барока, з’яўляецца першым у гісторыі еўрапейскай літаратуры зборнікам казачнага фальклору. Некаторыя з гэтых казак сталі хрэстаматыйнымі ў апрацоўках Шарля Перо і братоў Грым**



# Шарль Перо
## (1628-1703)

– французскі паэт, пісьменнік, тэарэтык мастацтва і крытык эпохі класіцызму, які збіраў і апрацоўваў народныя казкі, «легалізаваўшы» казку ў сур’ёзнай літаратуры

**У аснове казак Шарля Перо — вядомыя фальклорныя сюжэты, якія пісьменнік пераказаў з уласцівым яму талентам і гумарам, апускаючы некаторыя дэталі і дадаючы новыя.**

**Гісторыі пра дзяўчынку ў чырвонай шапачцы, ката ў ботах, «сінюю бараду» адрозніваюцца зразумелымі і займальнымі сюжэтамі, таму гэтыя казкі добра падыходзяць дзецям.**

**Менавіта па гэтай прычыне Шарля Перо лічаць пачынальнікам дзіцячай сусветнай літаратуры.**




# «Казкі матухны гускі, або гісторыі і казкі былых часоў з павучаннямі» (1697)

**– самы вядомы зборнік Шарля Перо, які ўяўляе сабой літаратурную апрацоўку народных казак**

(лічыцца, што аўтар пачуў гэтыя казкі ад карміліцы свайго сына, і толькі казка «Рыке-хахалок» складзена самім Ш.Перо)



# Якаб (1785-1863) і Вільгельм (1786-1859) Грым

– вядомыя нямецкія пісьменнікі, члены Берлінскай Акадэміі навук, мовазнаўцы, збіральнікі і апрацоўшчыкі паданняў, міфаў і народных казак

**Браты Грым пачалі збіраць нямецкія народныя казкі ў 1806 годзе. Дапамогу ў збіранні казак аказвалі розныя людзі: нямецкія паэты-рамантыкі, малодшая сястра Лота, якая знаёміла братоў са знаўцамі казак і легенд.**

**Работа братоў Грым выклікала да жыцця ажыўленую збіральніцкую дзейнасць у многіх еўрапейскіх краінах. Паняцце «казка» стала суадносіцца не толькі з народнай, але і літаратурнай казкай. У літаратуразнаўстве гучаць першыя спробы даць азначэнне літаратурнай казцы**




# «Казкі братоў Грым» (1812)

— дакладная назва – «Дзіцячыя і хатнія казкі».

**Ужо першае выданне зборніка мела вялікі поспех. Праз тры гады браты падрыхтавалі працяг гэтага зборніка. Атрымаўся двухтомнік, які змяшчаў адпаведна 86 і 70 казак. Гэты зборнік быў пакладзены ў аснову ўсіх наступных перавыданняў**



# Ханс-Крысціян Андэрсан (1805-1875)

– дацкі пісьменнік, аўтар сусветна вядомых казак для дзяцей і дарослых.

Пісьменнік, якому з дапамогай казкі ўдалося выказаць свае думкі, пачуцці, свой светапогляд, сваё стаўленне да рэчаў




# Х.-К. Андарсан

– аўтар 3342 твораў, якія перакладзены на 125 моў.

**Сярод іх:**

**«Гадкае качаня»**
**«Новая сукенка караля»**
**«Дзюймовачка»**
**«Устойлівы алавяны салдацік»**
**«Прынцэса на гарошыне»**
**«Оле Лукойе»**
**«Снежная каралева»**
**«Русалачка» і інш.**

**У тэматыцы сваіх казак, у іх вобразах Х.-К Андэрсан выходзіць далёка за межы той архаічнай рэчаіснасці, якая назіраецца ў дацкіх народных казках. І ўсё гэта таму, што казка была для Х.-К. Андэрсана не толькі літаратурным жанрам, не толькі сукупнасцю фантастычных падзей, а чымсьці значна большым.**

**У казцы Андэрсан знайшоў форму, у якой здолеў арганічна выказаць сваё стаўленне да жыцця. Казка ў нейкай меры з'явілася для пісьменніка спосабам пазнання свету**



# Рэдзьярд Кіплінг
# (1865-1936)

— англійскі пісьменнік, паэт, журналіст, вандроўнік.

Першы англічанін, які атрымаў Нобелеўскую прэмію (1907) па літаратуры і стаў самым маладым нобелеўскім лаўрэатам за ўсю гісторыю прэміі

**Творчасць Р. Кіплінга – адна з самых яскравых з’яў неарамантычнага накірунку ў англійскай літаратуры.**

**У творах пісьменніка паказаны суровы побыт і экзотыка англійскіх калоній. Р.Кіплінг развеяў ходкі міф аб чароўнай роскашы Усходу і стварыў сваю казку – аб Усходзе суровым, жорсткім у адносінах да слабых. Пісьменнік распавёў еўрапейцам аб магутнай прыродзе, якая патрабуе ад кожнай істоты напружання ўсіх фізічных і духоўных сіл**




# «Кніга джунгляў» (1894)

**— самы вядомы зборнік расказаў Р.Кіплінга**

**Расказы ў «Кнізе джунгляў» з'явіліся пад уражаннем ад старажытных індзійскіх казак**



# Сельма Лагерлёф (1858-1940)

– швецкая пісьменніца, палітык, прадпрымальнік і змагар за выбарчыя правы для жанчын.

Першая жанчына, якая атрымала Нобелеўскую прэмію па літаратуры (1909), і трэцяя жанчына, што атрымала Нобелеўскую прэмію (пасля Марыі Кюры і Берты Зутнер).




# «Цудоўнае падарожжа Нільса з дзікімі гусямі» (1906)

– казачная аповесць, напісаная як займальны дапаможнік па геаграфіі Швецыі ў літаратурнай форме для 9-гадовых дзяцей (вучняў першага класа).

**Поўная назва «Дзіўнае падарожжа Нільса Хольгерсана з дзікімі гусямі па Швецыі»**

**Хуліган Нільс стварае шмат праблем усім, асабліва бацькам. Ён мучыць жывёл дзеля забавы. Аднойчы, калі бацькоў не было дома, Нільс убачыў нісэ і стаў дражніць яго. За гэта нісэператварае самога Нільса ў нісэ. З гэтага часу Нільс пачынае бачыць навакольны свет вачыма тых, каго ён да гэтага мучыў.**

**Кніга напісана так, што дазваляе дзіцяці пазнаёміцца з геаграфіей Швецыі, яе традыцыямі і культурнымі асаблівасцямі.**

**Сельма Лагерлёф паказвае родную краіну вачыма дзіцяці, у займальнай форме спалучае геаграфію і казку.**



# Алан Аляксандр Мілн

## (1882 – 1956)

– брытанскі пісьменнік, паэт і драматург, найбольш вядомы як аўтар казачных апавяданняў пра «мядзведзя з апілкамі ў главе» – Віні-Пуха




# «Вiнi-Пух і ўсе-ўсе-ўсе» (1926)

– кніга, якая фактычна з’яўляецца зборнікам апавяданняў пра цацачнае мядзведзяня. Кожную главу можна чытаць паасобку, за выключэннем 9 і 10, якія сюжэтна звязаныя паміж сабой



# Крыстафер Робін

– галоўны герой апавяданняў пра Віні-Пуха.

Прататыпам стаў сын пісьменніка Крыстафер Робін. Гэта кемлівы і знаходлівы хлопчык, які заўсёды прыходзіць на дапамогу, пасмейваецца над глупствамі сваіх цацачных сяброў










# Антуан дэ Сэнт-Экзюперы

**(1900-1944)**

**— французскі пісьменнік, журналіст, сцэнарыст, паэт, прафесійны лётчык**




# «Маленькі прынц» (1943)

– самы вядомы твор А. дэ Сэнт-Экзюперы.

Гэта алегарычная казка, у якой гучаць матывы гуманізму, вера ў перамогу дабра, крытыка абывацельскай абыякавасці

**Сюжэт казкі, на першы погляд, нескладаны: пацярпелы аварыю ў пясках Сахары лётчык сустракаецца з Маленькім прынцам. Маленькі прынц просіць намаляваць яму баранчыка. Пасля шматлікіх няўдалых спробаў лётчык намаляваў скрыню, сказаўшы, што баранчык знаходзіцца ўнутры.**

**«Вось такога якраз я і хацеў!» – сказаў Маленькі прынц, якому, мабыць, спадабаўся такі жарт лётчыка, і паміж імі ўсталявалася паразуменне.**

**Зразумець да канца глыбіню, філасофскую накіраванасць гэтай казкі можа толькі чалавек з вялікім жыццёвым вопытам. Але гэта цёплая, пяшчотная казка, таму яе можна адрасаваць дзецям**